Алена Зубрыцкая



Загадчык аддзела
Маладзечанскай
цэнтральнай раённай бібліятэкі
імя Максіма Багдановіча

# «ПІСЬМЕННІК ДАБРЫНІ І ШЧЫРАСЦІ»: ВІРТУАЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ ГАЛУБОВІЧА

Далучэнне да кнігі і чытання – галоўная задача кожнай бібліятэкі. Сёння ўстановы культуры актыўна выкарыстоўваюць новыя тэхналогіі і магчымасці віртуальнай прасторы для папулярызацыі бібліятэчнай справы, прыцягнення карыстальнікаў. Сучасным і зручным інструментам, які дапаўняе і пашырае спектр паслуг, што аказваюцца чытачам, з'яўляецца сайт бібліятэкі.

У 2022–2023 гг. Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна рэалізавала абласны літаратурна-краязнаўчы праект «Пісьменнікі-ўраджэнцы роднага краю», прысвечаны папулярызацыі літаратурнай творчасці сваіх землякоў сярод дзяцей і падлеткаў. Мэтай праекта стала фарміраванне пачуцця любові да малой радзімы, яе гістарычнай памяці, папулярызацыя інфармацыі пра творчасць беларускіх пісьменнікаў, развіццё творчых літаратурных здольнасцей дзяцей і моладзі праз даследчую працу, удзел у літаратурных конкурсах.

Адным са спосабаў рэалізацыі праекта стала стварэнне на сайтах бібліятэк віртуальных музеяў, прысвечаных пісьменнікам-ураджэнцам краю, далучэнне да даследчай дзейнасці па зборы дакументальных матэрыялаў па жыццёвым і творчым шляху пісьменнікаў дзяцей і моладзі, правядзенне ў 2023 г. конкурсу па стварэнні віртуальных музеяў сярод бібліятэк Мінскай вобласці.

Супрацоўнікі Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Максіма Багдановіча стварылі на сайце бібліятэкі віртуальны музей «Пісьменнік дабрыні і шчырасці», які прысвечаны члену Саюза пісьменнікаў Беларусі – Івану Іванавічу Галубовічу (Янка Галубовіч, Янка Баравы). Згодна з рашэннем пасяджэння сяброў журы ад 12 снежня 2023 г. «Аб выніках абласнога конкурсу на стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу на сайце бібліятэкі ў рамках абласнога праекта "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю"», наша бібліятэка атрымала дыплом 3-й ступені [1].

Янка Галубовіч – аўтар 16 кніг прозы для дзяцей і дарослых. Акрамя таго, яго казкі і апавяданні ўвайшлі ў дзясяткі калектыўных зборнікаў, школьныя хрэстаматыі, анталогіі. Уключаны ў падручнікі па беларускай мове з першага па чацвёрты клас. Мудрыя казкі, апавяданні пісьменніка фарміруюць асобу маленькага чалавека, уплываюць на характар, вучаць любіць прыроду, сваю краіну, мову.

Галоўныя тэмы яго кніг для дарослых – дэградацыя чалавека як асобы, страта маральных прынцыпаў і ідэалаў, адсутнасць самапавагі і гонару, крывадушша і, як вынік усяго гэтага, поўная абыякавасць да сваёй будучыні. Ёсць у яго апавяданні і на тэму Вялікай Айчыннай вайны, пісаў аўтар і пра герояў Афганістана. Багата і вобразна распавядаў пра жыццё беларускай вёскі. Унікальныя і яскравыя яго апавяданні аб прыродзе.

У творчым спісе празаіка ёсць і вострасюжэтныя дэтэктыўныя аповесці, у якіх расказваецца пра трывожныя будні супрацоўнікаў крымінальнага вышуку. Знаёмячыся з гэтымі аповесцямі чытачы даведваюцца, як супрацоўнікам міліцыі за кароткі час удаецца раскрыць злачынствы.

Створаны электронны інфармацыйны рэсурс змяшчае інфармацыю аб жыцці і творчасці пісьменніка, папулярызуе яго творы і ўшаноўвае памяць (https://molib.by/golubovich/). Перайсці ў яго можна праз укладку «Віртуальныя музеі» на галоўнай старонцы сайта Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Максіма


Квэст-гульня па творчасці Я. Галубовіча. Фота А. Зубрыцкай

Багдановіча, затым праз кнопку «Пісьменнік дабрыні і шчырасці: віртуальны музей Янкі Галубовіча».

Віртуальны музей складаецца з 12 раздзелаў. На галоўнай старонцы змяшчаюцца іх назвы і партрэт пісьменніка.

У раздзеле «Жыццяпіс», у сваю чаргу, ёсць падраздзел пра в. Пранчэйкава Гарадоцкага сельсавета Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці, дзе нарадзіўся і вырас пісьменнік.

Далей ідзе кароткі біяграфічны нарыс. Пісьменніку давялося паспрабаваць сябе на многіх жыццёвых пуцявінах. Вучыўся Янка Галубовіч у Пранчэйкаўскай сямігадовай школе (восьмы клас скончыў у в. Гарадок), Глыбоцкім вучылішчы механізацыі, Мінскім фінансавым тэхнікуме і на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Служыў у арміі, працаваў на трактарным заводзе ў Рубцоўску (Расійская Федэрацыя), заводзе сілавых паўправаднiковых вентыляў (цяпер «Электрамодуль») у Маладзечне.

У падраздзеле «Незабыўныя сустрэчы» расказваецца пра сустрэчы Янкі Галубовіча з тымі, хто сёння з'яўляецца гонарам беларускай літаратуры. Гэта драматург Іван Козел, празаік Аркадзь Чарнышэвіч і інш.

У раздзеле «Фотахроніка» размешчаны здымкі пісьменніка. Ёсць яго фота ў маладым узросце, у дні армейскай службы, на сямейных святах, а таксама з дакументаў. Гэта ваенны білет, дыпломы аб сканчэнні фінансавага тэхнікума і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, членскі білет Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Шэраг фотаздымкаў расказвае аб удзеле Янкі Галубовіча ў мерапрыемствах бібліятэк. Яго запрашалі на творчыя сустрэчы з чытачамі, у журы літаратурных конкурсаў, пасяджэнні літаратурна-краязнаўчага аб'яднання «Жывіца», якое працавала пры цэнтральнай раённай бібліятэцы, штогадовыя выязныя імпрэзы ў Ракуцёўшчыне, прысвечаныя Дню памяці Максіма Багдановіча і інш.

У раздзелах «Кнігі» і «Зборнікі» прыводзяцца вокладкі кніг Янкі Галубовіча і анатацыі да іх, прадстаўлены анталогіі, калектыўныя зборнікі, школьныя падручнікі, хрэстаматыі, перыядычны друк, дзе былі змешчаны творы Янкі Галубовіча. Часта яго творы друкаваліся ў вядучых рэспубліканскіх выданнях (часопісах «Полымя», «Маладосць», «Алеся», «Родная прырода», «Вожык») і амаль што ў кожным нумары «Маладзечанскай газеты».

У раздзеле «Слова» размешчаны артыкулы аб Янку Галубовічу, якія друкаваліся ў перыядычных выданнях. Раздзел «Рукапісы» прыводзіць некалькі рукапісаў абразкоў і артыкулаў Янкі Галубовіча.

Пісьменнік з'яўляўся актыўным членам літаратурнага аб'яднання «Купалінка», якое працавала пры «Маладзечанскай газеце». На сайце прыводзяцца сканы некалькіх старонак «Купалінкі», дзе друкаваліся творы Янкі Галубовіча.

Далей прыводзіцца бібліяграфічны спіс артыкулаў пра Янку Галубовіча, якія друкаваліся ў перыядычных выданнях, і даецца інфармацыя, прысвечаная памяці пісьменніка. Размяшчаюцца анлайн-гульні: анлайн-крыжаванка, анлайн-віктарына, квэст-рум.

Таксама на сайце размешчана рубрыка «Матэрыялы да правядзення мерапрыемстваў», прысвечаных Янку Галубовічу. Гэта сцэнарныя матэрыялы, гульні, крыжаванка, медыяпрэзентацыя і інш.

Прэзентацыя віртуальнага музея адбылася ў лістападзе 2022 г. У мерапрыемстве прынялі ўдзел родныя і сябры пісьменніка, педагогі, супрацоўнікі бібліятэкі, актыўныя чытачы, навучэнцы політэхнічнага каледжа. Да вечарыны была падрыхтавана выстаўка кніг пісьменніка, якая сведчыла аб яго плённай творчасці.

Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя Максіма Багдановіча быў распрацаваны раённы бібліятэчны праект «Пісьменнік дабрыні і шчырасці», мэтай якога стала фарміраванне пачуцця любові да малой радзімы, яе гістарычнай памяці, папулярызацыя творчасці пісьменніка Янкі Галубовіча, развіццё творчых здольнасцей дзяцей і моладзі, арганізацыя іх вольнага

часу. У межах рэалізацыі гэтага праекта адбыўся шэраг мерапрыемстваў, інфармацыя аб якіх размешчана ў раздзеле віртуальнага музея «Мерапрыемствы па ўшанаванні памяці Янкі Галубовіча».

Супрацоўнікамі бібліятэк у 2023 г. было арганізавана некалькі конкурсаў па творчасці Янкі Галубовіча. Адзін з іх – анлайн-конкурс буклукаў па кнігах пісьменніка. Конкурс праходзіў у жніўні – верасні 2023 г. сярод чытачоў і бібліятэкараў Маладзечанскага раёна. Удзельнікам конкурсу прапаноўвалася стварыць фотакампазіцыю, дзе галоўны элемент – кніга, выкарыстоўваючы выразныя сродкі, розныя атрыбуты ў афармленні і элементы дэкору, якія адпавядалі тэме і настрою здымка.

Канкурсанты, ствараючы буклук, праявілі творчасць і фантазію, вельмі адказна падышлі да падбору атрыбутаў, якія раскрываюць змест кнігі, выкарыстоўвалі розныя магчымасці, каб перадаць настрой твора. На конкурс было даслана больш за 50 работ. Пераможцы вызначаліся шляхам інтэрнэт-галасавання. Вынікі былі прадстаўлены на сайце бібліятэкі. Пераможцы атрымалі дыпломы і падарункі.

Раённы конкурс мастацкіх вырабаў «У любую пару года слухай родную прыроду» праходзіў сярод жыхароў раёна і горада. Адной з галоўных задач конкурсу было прыцягненне ўвагі шырокай аўдыторыі да вывучэння твораў Янкі Галубовіча. Конкурс праходзіў у дзвюх намінацыях: вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на плоскасці і вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў аб'ёме сярод дзяцей і дарослых. У конкурсе прынялі актыўны ўдзел чытачы, бібліятэкары і майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія прадставілі членам журы  больш за 70 работ.

Удзельнікі фантазіравалі і рабілі арыгінальныя, прыгожыя вырабы. У выніку такой творчай дзейнасці былі прадстаўлены работы з паперы і пластыліна, дрэва і пенапласта, вязаныя цацкі, вырабы з прыродных матэрыялаў і інш. Выставачная экспазіцыя конкурсных работ была аформлена на абанеменце аддзела па абслугоўванні дзіцячага чытача цэнтральнай бібліятэкі. Пераможцы ўзнагароджаны дыпломамі і прызамі. Менавіта такія конкурсы садзейнічаюць папулярызацыі творчасці пісьменнікаў, дапамагаюць удзельнікам раскрыцца, развіць мастацкі густ і праявіць свае таленты. Але самае галоўнае, можна весела і з карысцю бавіць вольны час з сябрамі.

Трэці конкурс праводзіўся сярод бібліятэкараў публічных бібліятэк Маладзечанскага раёна. Гэта конкурс літаратурна-краязнаўчых крыжаванак «Ад студзеня да студзеня» па творчасці Янкі Галубовіча, які праходзіў з 1 сакавіка па 30 верасня 2023 г. Бібліятэкары з захапленнем уключыліся ў дадзеную работу, праяўляючы творчасць і незвычайную фантазію. У выніку кожная бібліятэка зрабіла напрацоўкі, якія будуць выкарыстаны ў рабоце з дзіцячым чытачом. Аўтары дапоўнілі свае маляўнічыя крыжаванкі рэбусамі, размалёўкамі, загадкамі і ншымі гульнёвымі элементамі.

Такім чынам, у публічных бібліятэках Маладзечанскага раёна прайшло больш за 20 мерапрыемстваў у межах праекта. Цікавымі былі квэст-гульня «Хто рукавічку згубіў?», поле цудаў «Па лясных сцяжынках», літаратурная гасцёўня «Падарожжа ў свет прыроды», конкурс малюнкаў «Каляндар прыроды Янкі Галубовіча», выстаўка-квэст «Дзівосы роднай прыроды», літаратурна-забаўляльная праграма «Ад студзеня да студзеня» і інш. Інфармацыю аб гэтым вы можаце знайсці ў віртуальным музеі ў раздзеле «Ушанаванне памяці Янкі Галубовіча» на сайце Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Максіма Багдановіча.

Бібліятэка працягвае даследчую і пошукавую работу па зборы матэрыялаў аб знакамітых земляках – жыхарах Маладзечанскага раёна. Па выніках гэтай працы ствараюцца віртуальныя музеі, якія ўяўляюць сабой сайты, размешчаныя на серверы. Яны змяшчаюць фота- і відэаматэрыялы, архіўныя дакументы, газетныя артыкулы і інш.

Стварэнне такой запатрабаванай інфармацыі, несумненна, будзе садзейнічаць развіццю бібліятэчнай справы, папулярызацыі краязнаўчых ведаў сярод карыстальнікаў, жыхароў Маладзечанскага раёна і гасцей горада.

ЛІТАРАТУРА

1. **Вынікі** абласнога конкурсу на стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу пра пісьменніка-земляка на сайтах бібліятэк [Электронны рэсурс] / Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна. – 2024. – Рэжым доступу: https://pushkinka.by/ресурсы/новости/document-75123.html. – Дата доступу: 02.04.2024.

Summary

The article presents the virtual museum of Yanka Golubovich, implemented by the Central Regional Library named after Maxim Bogdanovich of Molodechno.